ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР*
### *ART HISTORY, ETHNOGRAPHY, FOLKLORE*

УДК 394(497)
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-4-476-481

Паступіў у рэдакцыю 21.08.2018
Received 21.08.2018

**А. І. Лакотка**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ І АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ АКАДЭМІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У ГАЛІНЕ КУЛЬТУРЫ, МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

**Аннотация.** Статья посвящена научной деятельности Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси, созданного в 2012 г. на базе институтов искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы, языка и литературы им. Я. Коласа и Я. Купалы. Анализируются этапы исследовательской деятельности институтов, созданные фундаментальные научные труды, научные школы, вклад в развитие гуманитарной науки ведущих ученых, ближайшие и отдаленные перспективы исследований в областях культуры, языка и литературы.

**Ключевые слова:** белорусская культура, языкознание, литературоведение, фундаментальные и прикладные исследования, научные труды, научные школы, многотомные издания, научное сотрудничество

**Для цитирования.** Лакотка А. І. Стратэгія развіцця і асноўныя напрамкі акадэмічных даследаванняў у галіне культуры, мовы і літаратуры / А. І. Лакотка // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2018. – Т. 63, № 4. – С. 476–481. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-4-476-481

**A. I. Lokotko**

*Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## DEVELOPMENT STRATEGY AND MAIN DIRECTIONS OF ACADEMIC RESEARCH IN THE FIELD OF CULTURE, LANGUAGE AND LITERATURE

**Abstract.** The article is devoted to the research of the Center for Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus that was created in 2012 on the basis of K. Krapiva Institute of Art Studies, Ethnography and Folklore, Y. Kolas and Y. Kupala institutes of language and literature. The stages of the institutes research activity, fundamental scientific works, scientific schools, contribution to the humanities of leading scientists, and immediate and remote prospects of research in the fields of culture, language and literature are analyzed.

**Keywords:** Belarusian culture, science of language, study of literature, basic and applied researches, scientific works, scientific schools, multivolume editions, scientific cooperation

**For citation.** Lokotko A. I. Development strategy and main directions of academic research in the field of Culture, Language and Literature. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryya Humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2018, vol. 63, no. 4, pp. 476–481 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-4-476-48

Буйнейшай дзяржаўнай навуковай установай краіны, стратэгічная задача якой – навуковае забеспячэнне дзяржаўнай палітыкі ў галіне ўстойлівага развіцця нацыянальнай культуры, з'яўляецца Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Цэнтр праводзіць фундаментальныя і прыкладныя даследаванні ў галінах народных і прафесійных мастацтваў, этналогіі і фалькларыстыкі, мовазнаўства і літаратуразнаўства, мэта якіх – стварэнне аб'ектыўнай гісторыі паходжання беларускага народа, раскрыццё ўнікальнасці народна-традыцыйнай культуры, развіцця і функцыянавання беларускай мовы, праблем літаратуры.

Вынікамі даследаванняў Цэнтра з'яўляюцца фундаментальныя, шматтомныя выданні па:
– этнагенезу і этнічнай гісторыі беларусаў;
– відах і жанрах народнай вуснапаэтычнай творчасці;
– этнакультурных працэсах рэгіёнаў краіны;

© Лакотка А. І., 2018

– гісторыі мастацтваў (па напрамках);
– збору помнікаў гісторыі і культуры (рухомых і нерухомых);
– гісторыі гарадоў і вёсак Беларусі;
– лексікалогіі;
– дыялекталогіі;
– гісторыі беларускай літаратуры;
– праблемах літаратурнага працэсу ў гістарычным і сучасным кантэксце.

Цэнтр мае крыніцазнаўчую базу, якую складаюць напрацаваныя за дзесяцігоддзі лексічныя калекцыі, фальклорныя запісы, творы старажытнабеларускага мастацтва. Пастановай Урада Беларусі калекцыям фальклору і твораў мастацтваў нададзены статус Нацыянальнага навуковага здабытку.

Цэнтр мае навуковыя школы па мовазнаўстве, літаратуразнаўстве, этналогіі і фалькларыстыцы, тэатральным, музычным, экранных мастацтвах, выяўленчым, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве і архітэктуры.

У Цэнтры працуе чатыры саветы па абароне доктарскіх дысертацый у галінах мовазнаўства і літаратуразнаўства, мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі.

Напрамкі навуковых даследаванняў Цэнтра размеркаваны па інстытутах, якія дзейнічаюць на правах філіялаў:
– Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы;
– Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа;
– Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы.

Вынікі даследаванняў Цэнтра маюць міжведамасную запатрабаванасць і ўкараняюцца ў міністэрствах культуры, адукацыі, інфармацыі, архітэктуры і будаўніцтва, спорту і турызму, а таксама ў структурах рэспубліканскіх, рэгіянальных, мясцовых і гарадскіх органаў улады.

Па запатрабаваннях органаў улады, грамадскіх арганізацый, прыватных асоб Цэнтр прадстаўляе вялікую колькасць экспертных заключэнняў, спецыяльных даведак, адміністрацыйных працэдур, ажыццяўляе ўзгадненне навукова-праектных рашэнняў па рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры і прызначэнне адпаведных навуковых кіраўнікоў.

Для павышэння эфектыўнасці міжгаліновага і міжнароднага выкарыстання вынікаў дзейнасці Цэнтра ў ім створаны кластары:
– Міжнародны Цэнтр беларускай культуры;
– Міжнародная школа даследавання беларускай мовы і літаратуры;
– Рэспубліканская лабараторыя гісторыка-культурнай спадчыны.

Пашырэнне навуковых і культурных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і краінамі Усходу робіць актуальным стварэнне ў бліжэйшай перспектыве спецыяльнага кластара – Цэнтра ўсходазнаўства.

Цэнтр развівае навуковае супрацоўніцтва больш чым з 50 навуковымі ўстановамі СНД, Еўропы, Амерыкі, Азіі і Блізкага Усходу. Вучоныя Цэнтра прадстаўлены ў Еўрапейскім савеце па культуры, Арганізацыі па народнай творчасці пры ЮНЕСКА, Міжнародным камітэце славістаў і іншых прадстаўнічых міжнародных арганізацыях па навуцы, культуры і мастацтвах. Вядучыя навукоўцы Цэнтра ўзначальваюць творчыя саюзы і навукова-метадычныя саветы пры галіновых міністэрствах і ведамствах.

На бліжэйшую перспектыву плануецца распрацоўка прынцыпова новых, актуальных для дзяржавы праблем:

– стварэнне новай парадыгмы беларускай культуры як сукупнасці народна-традыцыйнай, прафесійнай, элітарнай, шматканфесійнай культур, культур этнічных груп, вызначэнне сучаснага сацыяльна-культурнага кода беларускага народа;

– даследаванне культуры дыяспары і шляхоў пашырэння адносін з беларусамі замежжа ў рамках дзяржаўнай праграмы «Беларусы ў свеце», вывучэнне беларускай гісторыка-культурнай спадчыны ў замежных музеях, калекцыях і зборах;

– стварэнне нацыянальнага інвентару нематэрыяльнай культурнай спадчыны;

– адаптацыя інавацыйных тэхналогій для сферы аховы і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры;

– падрыхтоўка сучаснага шматтомнага тлумачальнага слоўніка беларускай мовы;

– даследаванне сучасных літаратурных працэсаў, праблем літаратурнай творчасці, працяг выдання шматтомнікаў твораў знакамітых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, помнікаў беларускіх старадрукаў.

**Філіял «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы».** Інстытут створаны ў 1957 г., каля вытокаў яго фарміравання, вызначэння навуковых напрамкаў і складання навуковых школ стаялі буйныя вучоныя: акадэмік П. Ф. Глебка, члены-карэспандэнты У. І. Няфёд, В. К. Бандарчык. Значны ўклад у стварэнне новых напрамкаў даследаванняў (Збор помнікаў гісторыі і культуры, шматтомнікі «Беларуская народная творчасць», «Гісторыя беларускага мастацтва» і інш.) унеслі член-карэспандэнт С. В. Марцэлеў, А. С. Фядосік, Л. Н. Дробаў. Над стварэннем Музея старажытнабеларускай культуры плённа працавалі В. Ф. Церашчатава і Ф. Ф. Шматаў. Інстытут – унікальны шматпрофільны цэнтр па даследаванні мастацтва, этналогіі, фалькларыстыкі Беларусі, дзе працуюць 17 дактароў навук і 36 кандыдатаў (26 – маладыя вучоныя). У інстытуце створана база крыніц для даследавання пытанняў мастацтвазнаўства, фалькларыстыкі, этналогіі, якая налічвае каля 20 тыс. помнікаў старажытнабеларускага мастацтва, а таксама калекцыя фальклорных запісаў больш чым 400 тыс. помнікаў духоўнай культуры беларусаў, уключаных у Дзяржаўны рэестр навуковых аб’ектаў, што складаюць нацыянальны здабытак. Ганаровым званнем лаўрэата Дзяржаўнай прэміі адзначаны 29 вучоных інстытута. Спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і прэміяй «За духоўнае адраджэнне» ўзнагароджаны 11 супрацоўнікаў.

У інстытуце вядзецца падрыхтоўка вышэйшых навуковых кадраў па спецыяльнасцях «этнаграфія, этналогія», «фалькларыстыка», «тэатральнае мастацтва», «музычнае мастацтва», «кіна-, тэле- і іншыя экранныя мастацтвы», «выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура». Сфарміраваны і дзейнічае рад навуковых школ у галіне тэатразнаўства, этналогіі, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, архітэктуры, музычнага мастацтва, кіна- і тэлемастацтва.

У інстытуце працуюць два саветы па абароне доктарскіх дысертацый па спецыяльнасцях: этналогія і фалькларыстыка; тэатральнае, выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура, кіна- і іншыя экранныя мастацтвы. Два разы на год выдаецца навукова-тэарэтычны зборнік «Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі», які ўключае асноўныя сучасныя распрацоўкі беларускіх і замежных даследчыкаў.

У галіне мастацтвазнаўства вядзецца распрацоўка наступных актуальных тэм:

– «Архітэктурная і гісторыка-культурная спадчына ў развіцці традыцый і культурнай ідэнтычнасці Беларусі»;

– «Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі: актуальныя праблемы сучаснасці і перспектывы развіцця»;

– «Тэатральная і экранная культура Беларусі на мяжы XX–XXI стст.: захаванне нацыянальнай і сацыякультурнай ідэнтычнасці»;

– «Беларускія народнапесенныя традыцыі, кампазітарская творчасць і канцэртнае выканальніцтва ў кантэксце сусветнай музычнай культуры (1990–2010-я гг.)».

У галіне этналогіі пры распрацоўцы тэмы «Сучасныя этнічныя традыцыі Рэспублікі Беларусь» будзе вырашаны рад важных праблем сучаснага этнічнага развіцця Беларусі: выяўлены новыя этнічныя традыцыі ў Рэспубліцы Беларусь, што дасць магчымасць выкарыстаць іх у фарміраванні этнакультурных стратэгій, гарманізацыі міжкультурных і міжэтнічных адносін, вырашэнні задач нацыянальнага будаўніцтва і міжкультурнага дыялогу з замежнымі краінамі.

Навукова-даследчая работа ў ходзе распрацоўкі тэмы «Фальклорная спадчына беларусаў у сучасным славянскім свеце: паралелі, генезіс, лакальныя асаблівасці» будзе накіравана на падрыхтоўку мультымедыйных дыскаў па фальклорнай культуры рэгіёнаў; стварэнне «Беларускага фальклорна-этналінгвістычнага атласа»; укладанне тамоў з серыі «Беларуская народная творчасць»; навуковае рэдагаванне і падрыхтоўку да выдання рэгіянальных і лакальных фальклорных зборнікаў і атласаў, перыядычнага выдання «Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні»; навуковае забеспячэнне вучэбных курсаў у ВНУ краіны. У адпаведнасці з Праграмай супрацоўніцтва з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь рыхтуецца спіс нематэ-

рыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей для ўключэння ў нацыянальны рэестр і іх навуковае рэцэнзаванне. Важным раздзелам з'яўляецца работа па папаўненні фальклорнай калекцыі, стварэнне і аптымізацыя электроннага каталога, алічбаванне матэрыялаў. Захаванне і падтрыманне фальклорнай спадчыны будзе садзейнічаць устойліваму развіццю і гарманізацыі грамадства на аснове традыцыйнай сістэмы каштоўнасцей беларускага народа.

Акрамя таго, у рамках кластара «Міжнародны цэнтр беларускай культуры» праводзіцца кансультаванне будаўнічых і рэстаўрацыйных работ на аб'ектах рэспубліканскага значэння, ажыццяўляюцца спецыяльныя мастацтвазнаўчыя экспертызы і навукова-метадычнае суправаджэнне работ па ўсталяванні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь помнікаў і іншых твораў манументальнага мастацтва. Штогод праводзіцца Міжнародная навуковая канферэнцыя «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў». У 2016 г. адбыўся Міжнародны кангрэс беларускай культуры, у 2017 г. – Міжнародны фестываль традыцыйнага касцюма, у 2018 г. – Міжнародны форум даследчыкаў беларускай казкі.

За апошнія гады інстытутам выдадзены шматтомнікі «Гарады і вёскі Беларусі», «Нарысы гісторыі культуры Беларусі» (у 4 тамах, 5 кнігах), 24 выпускі навуковага зборніка «Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі», калектыўныя манаграфіі «Туристическая мозаика Беларуси», серыя «Современные этнокультурные процессы» (па рэгіёнах), тры выпускі зборніка «Беларускі фальклор», манаграфіі па тэатразнаўстве, музычным мастацтве, кіна- і экранных мастацтвах, альбомы па народным касцюме, народным мастацтве, слуцкіх паясах.

Прэміяй Нацыянальнай акадэміі навук адзначаны цыкл работ па архітэктуры і турызме (2013), Спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – работа па аднаўленні мастацкай традыцыі «Слуцкія паясы» (2016), прэміяй Года навукі – лепшая работа ў галіне гуманітарных навук (2017). За высокія навуковыя дасягненні медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны А. І. Лакотка (2016), Т. Г. Мдзівані (2018).

**Філіял «Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа».** Беларуская мова – дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусь, нацыянальная мова беларускага народа – з'яўляецца неад'емным атрыбутам незалежнасці краіны, важнейшым сродкам камунікацыі ў асноўных сферах зносін, фактарам кансалідацыі і яднання беларускай нацыі, галоўным элементам беларускай культуры.

Праведзеныя ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа шырокамаштабныя фундаментальныя даследаванні па словаўтварэнні, граматыцы, лексіцы, гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі вызначаюць развіццё ўсёй філалагічнай навукі ў Беларусі, а таксама беларусістыкі за межамі краіны.

Задачы Інстытута мовазнаўства на сучасным этапе.

*Фундаментальныя даследаванні:*

– лексікаграфічнае апісанне сучаснага стану лексічнай сістэмы беларускай мовы і дынамікі яе развіцця. Вынік – падрыхтоўка фундаментальнага «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» новага пакалення з улікам лексікаграфічных традыцый і інавацыйных метадалагічных падыходаў;

– сістэматызацыя і дыферэнцыраванне лексічнага матэрыялу беларускай дыялектнай мовы на аснове назапашанай базы ўніверсальнага лексічнага корпуса. Вынік – падрыхтоўка «Зводнага слоўніка беларускіх народных гаворак»;

– даследаванне сучаснага стану беларускага словаўтварэння, словазмянення і сінтаксісу. Вынік – распрацоўка новай нарматыўнай граматыкі беларускай літаратурнай мовы;

– даследаванне граматычнага і лексічнага ладу старабеларускай пісьменнасці. Вынік – завяршэнне выдання «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы» ў 38 тамах; падрыхтоўка «Гісторыка-этымалагічнага слоўніка запазычанняў у старабеларускай мове»;

– даследаванне этнамоўных кантактаў беларускай мовы са славянскімі і неславянскімі мовамі, вывучэнне беларускага этнакультурнага ландшафту ў экалінгвістычным аспекце. Вынік – завяршэнне выдання «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы» ў 15 тамах;

– правядзенне параўнальна-гістарычнага і сінхронна-тыпалагічнага вывучэння славянскіх дыялектаў. Вынік – падрыхтоўка чарговага выпуску агульнаславянскага лінгвістычнага атласа;

– даследаванне семантычных адносін у лексічных сістэмах сучасных рускай і беларускай моў. Вынік – падрыхтоўка манаграфіі «Сопоставительное описание русского и белорусского языков. Лексика»;

– стварэнне лексіка-граматычнай базы сучаснай беларускай мовы і аўтаматычнай сістэмы апрацоўкі тэкстаў. Вынік – стварэнне «Нацыянальнага корпуса беларускай мовы», што будзе садзейнічаць развіццю новых навуковых напрамкаў: аўтаматычнай сістэмы апрацоўкі тэкстаў, электронных перакладных слоўнікаў, праграмы сінтэзу маўлення.

*Прыкладныя даследаванні* павінны быць накіраваны на пераход ад традыцыйнага назапашвання фактаў і інфармацыі і засваення навуковых інавацый да павышэння іх сацыяльна-эканамічнай эфектыўнасці і магчымасці рэальнага прымянення ў розных сферах грамадскага і культурнага жыцця краіны.

На працягу дзейнасці інстытута (з 1929 г.) сфарміраваліся навуковыя школы, якія атрымалі прызнанне ў нашай краіне і за мяжой і ўнеслі вялікі ўклад у развіццё фундаментальных навуковых даследаванняў у галіне беларускага мовазнаўства: фанетычная, славістычная, гістарычная, лінгвагеаграфічная, анамастычная, словаўтваральная. У бліжэйшым будучым можна прагназаваць фарміраванне новых навуковых школ: сацыялінгвістычнай, што звязана з неабходнасцю поўнамаштабнага даследавання моўнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь, асаблівасцямі функцыянавання беларускай і рускай моў у розных сферах зносін і іх узаемадзеяння; корпуснай лінгвістыкі.

**Філіял «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы».** Літаратура, мастацтва слова і літаратуразнаўчая навука выконваюць важныя сацыяльныя функцыі: яны з’яўляюцца галоўным сродкам выхавання ў грамадстве мастацка-эстэтычных густаў, дапамагаюць усталяванню маральных і гуманістычных каштоўнасцей. Творы прыгожага пісьменства і літаратуразнаўчыя працы аказваюць сінтэтычнае ўздзеянне на інтэлектуальнае развіццё чалавека, фарміруюць духоўны свет асобы; праз мастацкія вобразы майстры слова ўсталёўваюць грамадскія ідэалы, ствараюць прыклады і ўзоры, вартыя пераймання.

Літаратуразнаўства служыць навукова-метадалагічным падмуркам літаратурнай адукацыі, з’яўляецца асновай класічных традыцый. Ва ўмовах глабалізацыі літаратура і літаратуразнаўства ў значнай ступені спрыяюць захаванню нацыянальнай ідэнтычнасці.

Галоўная мэта Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы – асэнсоўваць дыялектыку развіцця беларускага мастацтва слова ў кантэксце славянскіх, еўрапейскіх і сусветных духоўна-культурных працэсаў, развіваць ключавыя напрамкі нацыянальнай літаратуразнаўчай навукі, спрыяць сучаснаму літаратурнаму працэсу, ажыццяўляць якасную падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

Асноўнымі напрамкамі работ інстытута з’яўляюцца:

– распрацоўка фундаментальных праблем гісторыі і тэорыі літаратуры, кампаратывістыкі і тэксталогіі;

– падрыхтоўка збораў твораў класікаў беларускай літаратуры;

– выданне помнікаў старажытнай беларускай літаратуры;

– пашырэнне твораў беларускай літаратуры ў свеце;

– вызначэнне прыярытэтных напрамкаў развіцця нацыянальнага прыгожага пісьменства;

– выяўленне заканамернасцей развіцця беларускай літаратуры ў розныя гістарычныя эпохі;

– раскрыццё паэтыкі літаратурных родаў, відаў і жанраў;

– вызначэнне творчай індывідуальнасці найбольш значных майстроў мастацкага слова.

Важнейшы прыярытэт у дзейнасці Інстытута – развіццё акадэмічнай крытыкі з мэтай спрыяння сучаснаму літаратурнаму працэсу.

Задачы акадэмічнай крытыкі на бліжэйшы час: вызначэнне корпуса найбольш каштоўных твораў сучаснай беларускай літаратуры; выкананне навуковых даследаванняў і практычных распрацовак, якія маюць прыярытэтнае значэнне для культуры Рэспублікі Беларусь; стварэнне анталогій сучаснай беларускай літаратуры; фарміраванне электроннай базы даных, прысвечанай ключавым асобам і падзеям актуальнай беларускай літаратуры з мэтай пашырэння ведаў пра сучасны літаратурны працэс на Беларусі.

Адказнымі місіямі акадэмічнага літаратуразнаўства з’яўляюцца тэарэтычнае асэнсаванне гістарычнага развіцця беларускай літаратуры на працягу многіх стагоддзяў, распрацоўка метадалогіі тлумачэння пісьмовых помнікаў літаратуры. З гэтай мэтай у бліжэйшы час будзе выконвацца наватарскі праект «Герменеўтыка беларускай літаратуры XI – пачатку XX ст.». Наспела патрэба па-

дагульнення вопыту станаўлення і гістарычнага развіцця самога літаратуразнаўства, дзеля чаго плануецца ажыццявіць заданне «Гісторыя беларускага літаратуразнаўства (ХІ–ХХІ стст.)». Праектам «Развіццё сучаснай беларускай літаратуры: ідэйныя пошукі, жанравая структура, нацыянальная адметнасць» прадугледжваецца выяўленне разнастайнасці і багацця мастацкай палітры твораў беларускай літаратуры ХХ–ХХІ стст.

Адной з прыярытэтных задач, якія стаяць перад інстытутам, з'яўляецца суправаджэнне працэсу ўзаемадзеяння беларускай літаратуры з літаратурамі іншых народаў. Наладжаны кантакты паміж Інстытутам літаратуразнаўства і Пакістанскай літаратурнай акадэміяй для ўзаемадзення і супрацоўніцтва па выкананні Мемарандума аб намерах у галіне навуковага супрацоўніцтва, падпісанага Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Пакістанскай літаратурнай акадэміяй 10 жніўня 2015 г.

Ажыццяўленне праекта «Беларуска-еўрапейскія літаратурныя ўзаемасувязі і імагалогія: міфы, стэрэатыпы, рэальнасць» дазволіць асэнсаваць сістэму літаратурных вобразаў, якія ўспрымаюцца ў беларускім мастацкім кантэксце як іншанацыянальныя.

Даўно наспела неабходнасць паўнавартаснага развіцця беларускай тэксталагічнай школы, абагульнення шматгадовага вопыту беларускіх тэкстолагаў па падрыхтоўцы збораў твораў класікаў нацыянальнай літаратуры.

Вынікі працы Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы будуць спрыяць якаснаму абнаўленню сучаснага літаратурнага працэсу, усталяванню пераемнасці паміж класічнай традыцыяй і сучаснымі мастацка-эстэтычнымі пошукамі. Яны паслужаць пашырэнню і паўнавартаснаму прызнанню ў свеце найбольш каштоўных здабыткаў беларускага прыгожага пісьменства.

Перад навуковымі школамі і даследчыкамі Цэнтра стаяць задачы дзяржаўнага маштабу па забеспячэнні ўстойлівага развіцця нацыянальнай культуры, мовы, літаратуры. Вядучыя навуковыя напрамкі ўзначальваюць вядомыя ў краіне і за мяжой вучоныя: акадэмікі У. В. Гніламедаў, А. А. Лукашанец, члены-карэспандэнты М. Ф. Піліпенка, А. М. Булыка, С. С. Лаўшук, дактары навук І. В. Саверчанка, В. І. Жук, Т. В. Габрусь, А. М. Кулагін, В. П. Русак, М. П. Тычына, Г. А. Цыхун, А. У. Гурко. Плануюцца новыя фундаментальныя выданні: па праблемах архітэктуры і мастацтваў, стварэнні новага шматтомнага слоўніка беларускай мовы, шматтомных выданняў класікаў беларускай літаратуры, помнікаў беларускага пісьменства.

На ўзроўні сучасных тэхналогій і інсталяцый знойдзе працяг работа па папаўненні і папулярызацыі калекцый нацыянальнага навуковага здабытку.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Акадэмічная гуманітарыстыка: важнейшыя вынікі 2016 года / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў; А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 188 с.

2. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы: 60 год з дня заснавання / рэдкал.: А. І. Лакотка [і інш.]. – Мінск: Права і эканоміка, 2017. – 238 с.

3. Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы: 80 год (1929–2009 гг.). – Мінск: Права і эканоміка, 2009. – 104 с.

## References

1. Kovalenya A. A. [et al.]. *Academic humanities: the most important results of 2016*. Minsk: Belaruskaya Navuka Publ., 2017. 188 p. (in Belarusian).

2. Lokotko A. I. (ed.) [et al.]. *Institute of Arts, Ethnography and Folklore named after Kondrat Krapiva: 60 years since the foundation*. Minsk, Prava i ekanomika Publ., 2017. 238 p. (in Belarusian).

3. National Academy of Sciences of Belarus. *Institute of Language and Literature named after Yakub Kolas and Yanka Kupala: 80 years (1929–2009 gg.).* Minsk, Prava i ekanomika Publ., 2009. 104 p. (in Belarusian).

## Информация об авторе

**Локотко Александр Иванович** – академик, доктор исторических наук, доктор архитектуры, профессор, директор Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: bel-centre@bas-net.by

## Information about the author

**Alexandr I. Lokotko** – Academician, D. Sc. (Hist.), D. Sc. (Art. Crit.), Director of the Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: bel-centre@bas-net.by